Беларуская мова і літаратура. – 2023. – № 10. – С. 17–21.

**Л. М. Садко**

# МАТЫЎ СВЯТЛА Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА 1950-Х ГГ.

Адным з дамінуючых матываў у вершах зборнікаў “На камні, жалезе і золаце” (1951), “У дарозе” (1954), “След бліскавіцы” (1957) Максіма Танка стаў матыў святла. Гэты матыў мае доўгую і шматзначную гісторыю асэнсавання як у фальклорных, так і ў літаратурных тэкстах. Традыцыйна, святло разглядаецца ў кантэксце бінарнай канструкцыі святло / цемра, дзе святло, як жыццядайны пачатак, удзельнічае ў касмагоніі, устанаўленні гармоніі на зямлі. Максім Танк у творчасці 1950-х гг. як раз звярнуўся да адлюстравання аднаўлення і прасвятлення жыцця, пасляваеннай рэчаіснасці, радасцяў і цяжкасцяў савецкага чалавека. Акрамя касмаганічнай функцыі святло прыймае на сябе архаічную функцыю замовы, абярэга, калі шматлікія варыянты святла – світанне, бліскавіца, праменні, ззянне і бляск сонца і месяца, зор і г. д. – выконваюць функцыю аховы новага, счаслівага жыцця. Адзначым таксама, што шанаванне святла звычайнае для славян ад даўніны да сучаснасці.

Як слушна адзначае знаўца актуальнага ў сучаным літаратуразнаўстве феномена матывікі І. Сіланцьеў, “мотив как таковой представляет собой обобщенную форму семантически подобных событий, взятых в рамках определенной повествовательной традиции фольклора или литературы” [6]. У сваю чаргу Б. Гаспараў як адну з важных прыкмет матыва вылучае асаблівы прынцып “рэпрадукцыі”, лейтматыўнай будовы аповяду, «при котором некоторый мотив, раз возникнув, повторяется затем множество раз, выступая при этом каждый раз в новом варианте» [2, с. 30].

Мэта дадзенага даследавання – комплекснае вывучэнне сэнсаўтваральнай ролі матыва святла ў кантэксце мастацкага цэлага паэзіі Максіма Танка 1950-х гг.

Вершы дадзенага перыяду ў абсалютнай сваёй большасці дэманструюць асаблівае светаўспрыманне паэта: бадзёра-аптымістычнае, узнёслае. Досыць часта малюнкі рэчаіснасці і з’явы жыцця краіны Саветаў малююцца аўтарам у ідэалізавана-ўздымных вобразах – праз матывы ззяння, бляску, зіхацення, свячэння. Паказальна, што ў адным з вершаў 1952 года паэт слушна вызначае лейтматыў сваіх твораў, падкрэслівае семантычную значнасць святла:

Мне пару крыл дало юнацтва:
Адно – зары світальнай ззянне,
Парыў да сонца, да свабоды [8, с. 329].

У радках пералічваюцца рамантызаваныя атрыбуты: юнацтва, крылы, зоры, світанне, ззянне, сонца, парыў, свабода, якія на самой справе становяцца вызначальнымі для твораў Максіма Танка 1950-х гг.

У абсалютнай большасці вершаў зборнікаў “На камні, жалезе і золаце”, “У дарозе”, “След бліскавіцы” назіраецца зварот да сэнсаўтаваральнага матыву святла, ззяння. Гэты матыў мае станоўчую канатацыю, увасабляе і ідылічныя ўяўленні аб сучаснасці, і ўзнёслыя ўспаміны пра баявое мінулае, і аптымістычныя надзеі на будучыню. Максім Танк прапаноўвае розныя семантычныя “рэпрадукцыі” матыва святла як фізічнай з’явы: промні сонца, ззянне зор, бліскавіц, зары, электрычнасці. Акрамя таго, матыў святла і ззяння можа ўвасабляцца ў варыянтах энергіі сэрца, душы, барацьбы, надзеі на новае жыццё. Святло як фізічная з’ява традыцыйна сімвалізуе сувязь чалавека і сонца, архетыпічна атаясамліваецца з дзённым свяцілам.

Святло ў вершах Максіма Танка 1950-х гг. суадносіцца не толькі з фальклорна-архаічнымі ўяўленнямі, але і з каштоўнасцямі дзяржавы. Ззянне, ранак, усход маюць асацыяцыі з комплексам ідэй сацыялізму, сімвалізуюць шчаслівую будучыню, алегарычна супрацьпастаўляюцца "цёмнаму" мінуламу. Атаясненне "савецкасці" з асляпляльным святлом, ззяннем, бляскам робіцца ў шэрагу твораў згодна традыцыі ўсхвалення, напаўняецца пафасам оды.

У вершах Максіма Танка святло выпраменьваецца рознымі крыніцамі. Напрыклад, салярны культ шанавання **сонца** праяўляецца праз вобразы радаснага дня, цяпла, ззяння, свабоды, кахання: "А толькі сонца прамень прачнецца, – / Цяплом гарачым атуліць сэрца" (верш "У жнівень", 1950) [8, с. 254]; "І сонца зіхаціць высокае" (верш "На венгерскіх стэпах", 1951) [8, с. 281]; "Бо сонца мірнае ўстае, / Дзе слава Сталінграда ззяе", (верш "У Сталінградзе", 1951) [8, с. 291]; "Незгасальнае сонца свабоды" (верш "Петэфі", 1952) [8, с. 314]; "Сонца яркага ззянне" (верш "Пчаліны звон", 1956) [8, с. 517]; "Толькі не ад Мар'іных вачэй / Што гараць за сонца гарачэй" ("Прызнанне", 1954) [8, с. 464].

У комплекс матываў святла, ззяння ўваходзіць і вобраз начных свяціл – **зор, зорнага бляску, месяцу**, як у вершах "На венгерскіх стэпах", 1951 ("светлыя пуцяводныя зоры") [8, с. 280]; "Начлег каля Свіцязі", 1951 ("глядзеў на хвалі, на ззянне зор") [8, с. 296]; "Вяселле", 1952 ("і майскі вечар, і ў небе зоркі") [8, с. 358]; "Форт Ружана", 1952 ("Дзе нашай краіны сыны пахаваны, / Гараць незгасальныя зоры") [8, с. 363]; "Ноч на возеры", 1953 ("З-за абеліска месяц уставаў") [8, с. 409]; "Сад", 1953 ("Што стала зямля наша зоркай, / якая і грэе і свеціць") [8, с. 417]. Зоркі маюць у гэтых творах семантыку неўміручасці, выратавання і бясконцасці, а іх святло паказвае шлях, служыць павадыром у светлы край вечнасці і надзеі. Зорнае святло здольнае рассеяць цемру і падарыць свабоду.

Адна з крыніц святла, да якой звяртаецца Максім Танк, – гэта і вобразы **зары, ранка, світання**. У вершах паэта яны – сімвал абуджэння, абнаўлення, трыумфа света над цемрай, у шэрагу тэкстаў – перамогі савецкага ладу жыцця над іншымі. У вершы "Песня дружбы" (1951) гучыць упэўненасць у тым, што "лёс шару зямнога" залежыць "ад сцягу, што ззяе праменнем зары" [8, с. 291]. Слава савецкага воіна-вызваліцеля параўноўваецца таксама са светам ранка, што "край паўночны азарыў / нягаснучай зарой" (верш "Востраў Цьета", 1952) [8, с. 307]. Прыгажосць дзяўчыны ў фальклоры таксама досыць традыцыйна параўноўваецца з зарою, так, у паэме "Ля вогнішч начлежных" (1952) як раз пры апісанні галоўнай гераіні Максім Танк таксама ўжывае гэты прыём:

Хто бачыў яе, той забыць век не мог
Красы яе светлай, дзявочай,
І водсвет зары, што на твар яе лёг,
І косы, і сінія вочы [8, с. 335].

Сустракаюцца ў вершах пасляваенных гадоў і вобраз зіхацення **зоркі-ўзнагароды**, ордэна за баявыя подзвігі. Свет, што выпраменьвае гэтая зорка – найярчэйшы, ён ззяе адмыслова:

– Хто ж у вас брыгадзірам,
Што працуе так шчыра?
– Брыгадзірам наша Каця
Маладая:
На грудзях у яе зорка
Залатая (верш "Днём пагожым", 1950) [8, с. 252].

Крыніцай святла ў вершах паэта становяцца і рэаліі сучаснасці – **электрычныя агні**, як у вершы "Гідрастанцыя на Зяльвянцы" (1952): "Начамі па сёлах раёна / Агні

электрычныя ззяюць” [8, с. 305]. Пра новае жыццё і тэхнічны прагрэс апавядае Максім Танк і ў вершы “Перавал Штурэц” (1952):

Тут сягоння жыццё другое,
Тут сягоння… Ды што казаць!
Вось глядзіце: якой зарою
Будаўніцтва агні гарацы
І ў прарыве імглы, аблокаў
Мы пабачылі раптам з гор:
Па Славакіі ўсёй, далёка,
Пералівы чырвоных зор [8, с. 301].

Адзначым, што ўсе вершы, заснаваныя на вобразах з матыўнага комплексу ззяння і святла, малююць выявы велічы, радасці, гонару, прыгажосці. З аднаго боку, такое ўслаўленне жыцця і велічнасці ідэалогіі сацыялізму і камунізму выглядае аднабокім. Па словах даследччыка сучаснай беларускай літаратуры прафесара А. Макміліна, “як бы ні складвалася жыццё Танка, ён працягвае верыць у рэвалюцыйныя і сацыялістычныя ідэалы” [3, с. 212].

Але такое падкрэслена аптымістычнае ўслаўленне сучаснасці і перспектыў будучыні можа быць разгледжана ў сістэме эстэтычных і паэтычных патрабаванняў да заклінальных і велічальных песень, архаічных фальклорных жанраў. Па словах вучонага В. Прыемкі, у такіх песнях адлюстроўваецца “вера ў магічную сілу слова, якім нібыта можна ўздзейнічаць на чалавека або прыроду” [5, с. 212], а мэтавая ўстаноўка заклінальных і велічальных песень – “паказаць жаданае як бы ўжо існуючым дзеля набліжэння і ўвасаблення яго ў рэальным жыцці” [8, с. 213]. Менавіта такая велічальна-заклінальныя мадальнасць, значная колькасць вобразаў, звязаных з матыўным комплексам святла, ззяння, характэрызуюць вершы Максіма Танка 1950-х гг, дзе аб’ектам узвялічвання выступае жыццё ў краіне перамогшага сацыялізму, культава-салярных чырвоных зор і сцягоў.

Цікавым з пункту гледжання рэалізацыі матыву святла і ззяння падаецца верш “Светлячок” (1953). Светлячкі, героі дзіцячых вершаў і казак, малююцца звычайна чуллівымі і спагадлівымі. Сваімі агеньчыкамі яны падаюць верныя знакі ў цемры, а самі робяцца надзейнымі саюзнікамі, якім можна давяраць. Але ў вершы Максіма Танка такога ціхамірнага і ўлагоджанага трактавання вобраза светлячка не назіраецца. Верш пачынаецца з узгадкі галінкі менавіта плакучай вярбы, традыцыйна звязанай з асацыяцыямі смутку, журбы. Гісторыя, якую распавядае Максім Танк, – пра драматычны лёс светлячка, што пакахаў бліскучую расінку, а тая праз імгненне знікла, пакінуўшы героя ў самоце і вечным шуканні сваёй каханай:

Ды толькі адну мо хвілінку
Знаёмства цягнулася іх,
І сонца забрала расінку
З прастораў і з траў лугавых

Часамі яна ў аддаленні
З галінкі якой замігціць
Ды знікне зноў хутка ў праменні,
Пакуль светлячок дабяжыць.

А ён без яе ўжо сумуе,
Шукае і ноччу і днём
І вечна па свеце вандруе
З сваім залатым аганьком [8, с. 398].

У творы шмат слоў, што звязаны з семантыкай святла: “замігціць”, “праменні”, “светлячок”, “серабрысты”, “вясёлкавы”, “ззяе”, “залаты”, “аганёк”. Але матыў святла ў гэтым творы праяўляе сябе як увасабленне часовасці, хуткацечнасці, набывае трагічнае

гучанне нязбыўнага кахання. Расінка тут – амаль прывідны, блукаючы агонь, што вядзе светлячка да згубы.

Агульнавядома, што Максім Танк быў захоплены эстэтыкай і паэтыкай усходняй паэзіі. Асаблівую ролю ў разуменні паэтычнага свету верша “Светлячок” адыгрывае тое, што гэты верш з нехарактэрным для еўрапейскай традыцыі вобразам светлячка створаны Максімам Танкам па матывам сярэднявечнай японскай традыцыі “хотаругары” – любавання светлячкамі. У японскай мастацкай традыцыі свячэнне гэтых насякомых запальвае сэрцы, абуджае пачуцці ад сну, гаворыць аб тамленні кахання. Ужо пачынаючы з VIII ст. светлячкі ў паэзіі сталі метафарай палкага кахання. Японскі паэт XVIII ст. Таясу Мунэтакэ, майстра пяцірадкоўяў, танка, вось як будуе аповед пра закаханага светлячка (пераклад А. Долінай):

Не плачет навзрыд,
Но, пламени молча отдавшись,
Горит светлячок, –
Наверное, так же, как я,
Любовным недугом объят... [1, с. 792].

У паэзіі Максіма Танка 1950-х гг. вылучаецца шэраг вершаў, прысвечаных распрацоўцы тэмы мастака і мастацтва. Адзін з іх – праграмны верш “Паэзія” (1955), ён пабудаваны на прыёме антытэзы паміж святлом, радасцю і жыццём, якія ўвасабляе паэзія, і цемрай, пеклам і смерцю, якіх так шмат у лёсе чалавека і грамадства. Паэзія, на думку Максіма Танка, – гэта “бліскавіца, што хмары рассекла” [8, с. 496], “сонца, якое прасторы святлом азарыла” [8, с. 496]. Такім чынам, характэрны матыў ззяння, святла выкарыстоўваецца і для асэнсавання адной з самых актуальных тэм танкаўскай творчасці – аўтарэфлексіі мастака аб сваёй дзейнасці. Як раз у гэтым творы матыў святла ўпершыню праяўляе сябе праз вобраз бліскавіцы, што спалучае амбівалентныя тлумачэнні. Бліскавіца, маланка – гэта і дабратворная сіла ўзрушэння, абуджэння жыццёвых сіл, творчы імпульс, што вядзе да пазнання ісціны, і знішчальны нябесны агонь, што карае і разбурае. Тое, што паэзія атаясамліваецца з гэтай магутнасцю, – наогул, характэрная трактоўка для вершаў Максіма Танка, які абагаўляе паэзію, з’яўляецца адным з самых адданых ваяўнікоў прыгожага пісьменства.

Такім чынам, у паэзіі Максіма Танка 1950-х гг. матыў ззяння, святла не суадносіцца з вобразамі чароўнага, рэлігійнага, не мае дачынення і да вобразаў вечнасці, смерці і іншабыцця. Літаратуразнаўца М. Мікуліч адзначае: «Касмічнасць мыслення паэта, планетарны кантэкст бачання і асэнсавання той ці іншай праблемы дзівосным чынам сумяшчаюцца ў яго творах з пластыкай прадметнага аналізу, апеляцыяй да шматлікіх і характарыстычных акалічнасных дэталей. Падкрэсленая грамадзянска-палітычная заангажаванасць многіх вершаў, іх прамоўніцка-публіцыстычны пафас не толькі не адмаўляюць, а наадварот, прадугледжваюць наяўнасць гэтак званай прыватнай канкрэтыкі рэчаў, глыбокае выяўленне складанага і супярэчлівага свету асобы чалавека, раскрыццё яе найтанчэйшых душэўных перажыванняў» [4, с. 18].

Крыніцы святла ў вершах Максіма Танка заўсёды канкрэтныя, “заземленыя”, прымацаваныя да прыроднага аб’екту (сонца, зоры, ранак, месяц, залатыя зоркі-ўзнагароды, электрычныя агні). Сімвалічнае значэнне паняцця святла – «символ жизни, процветания, радости, мира, согласия» [7, с. 430]. Менавіта гэтыя значэнні найбольш блізкія эстэтычнай дактрыне Максіма Танка, выконваюць не толькі ідэалагічныя, але і аксіялагічныя задачы. Так, яны дазваляюць перадаць ідэю паэтычнага натхнення ад здзяйсненняў сучаснасці, перамогі над фашызмам, камуністычных дасягненняў і магчымасцей жыцця ў сацыялістычным грамадстве. З дапамогай матыву святла і ззяння перадаюцца эмоцыі захаплення, радасці, шчасця і любові. Скразным матывам у творах Максіма Танка 1950-х гг. з’яўляецца трыумф святла над цемрай, паэт актуалізуе

маральную праблематыку, звязаную з упэўненасцю ў непазбежнасці перамогі любові, дабрачыннасці, мудрасці, высокіх патрыятычных пачуццяў.

1. Библиотека всемирной литературы. Серия первая. Т. 16. Классическая поэзия Индии, Китая, Кореи, Вьетнама, Японии. – М. : Художественная литература, 1977. – 927 с.

2. Гаспаров, Б. М. Литературные лейтмотивы. Очерки по русской литературе XX века / Б. М. Гаспаров. – М. : Наука. Издательская фирма «Восточная литература», 1993. – 304 с.

3. Гніламёдаў, У. В. Над старонкамі паэзіі Максіма Танка / У. В. Гніламёдаў // Полымя. – 2006. – № 1. – С. 210–221.

4. Мікуліч, М. Паэзія рэчаіснасці: У свеце Максіма Танка / М. Мікуліч. – Мінск : Маст. літаратура, 2001. – 126 с.

5. Прыемка, В. Заклінальныя песні / В. Прыемка // Фалькларыстычныя даследаванні : Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. Вып. 10 ; пад нав. рэд. В. В. Прыемка, Т. В. Лук'янавай ; уклад. : Т. А. Марозава. – Мінск : 2013. – С. 212–213.

6. Силантьев, И. В. Лирический мотив в стихотворном и прозаическом тексте (статья первая) [Электронны рэсурс] / И. В. Силантьев // Сибирский филологический журнал. – 2009. – № 2. – Рэжым доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/liricheskiy-motiv-v-stihotvornom-i-prozaicheskom-tekste-statya-pervaya. – Дата доступа: 12.01.23.

7. Символы, знаки, эмблемы : энциклопедия ; авт.-сост. В. Багдасарян, И. Б. Орлов, В. Л. Телицын. – М. Локид-Пресс : Рипол классик, 2005. – 495 с.

8. Танк, М. Збор твораў у 2 тт. Т. 2 : Вершы і паэмы / Максім Танк. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1958. – 585 с.